ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

УШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ЗАГІНУЛЫХ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ

Толькі за пасляваенныя гады на Магілёўшчыне пры выкананні службовых абавязкаў абарвалася жыццё 40 супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Аб іх і ўсіх тых, хто ў розныя гады стаяў на ахове інтарэсаў свайго народа, успаміналі ў Магілёве падчас мітынгу-рэквіема каля памятнага знака ў гонар гэтых мужных людзей. Да падножжа мемарыяла былі ўскладзены кветкі і вянкі, а памяць гэтых герояў ушанавана хвілінай маўчання і трыма ружэйнымі стрэламі.

— Знамянальна, што ўрачыстасці, прысвечаныя Дню беларускай міліцыі, пачынаюцца менавіта тут, — адзначыў начальнік Магілёўскага УУС генерал-маёр Фёдар Балейка. — Нездарма кажуць, памяць — гэта не толькі помнік, гэта — непарыўная сувязь пакаленняў.

Падчас мітынгу лепшыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў былі ўзнагароджаны нагруднымі знакамі «Выдатнік міліцыі» і Ганаровымі граматамі. Яшчэ некалькі міліцыянераў атрымалі медалі «Служыць і абараняць» другой ступені, якія ім уручыў настаяцель Крыжаўзвіжанскага храма айцец Сергій.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО РАБІЦЬ У ПАЗАШТАТНАЙ СІТУАЦЫІ?

Сумесныя камандна-штабныя вучэнні Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях і аховы здароўя, Мінгарвыканкама прайшлі ў сталіцы для ўмацавання грамадскай бяспекі з нагоды правядзення ў маі чэмпіянату свету па хакеі.

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, 28 лютага на базе спартыўна-забаўляльнага комплексу «Чыжоўка-Арэна» прайшла практычная фаза вучэнняў. Сумесныя дзеянні дзяржструктур былі скіраваны на спыненне групавых парушэнняў грамадскага парадку рознага маштабу, рэагаванне падчас актаў тэрарызму з захопам закладнікаў і прымяненнем выбуховых рэчываў. Іншыя практычныя заняткі прадугледжвалі папярэджванне надзвычайных сітуацый, звязаных з эвакуацыяй грамадзян з ачагоў узгарання, выяўленне крыніц іанізуючага выпраменьвання і іншыя.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПУШЧАНСКІ ВОЎК... З АБРОЖКАМ

Папуляцыю пушчанскага ваўка вывучаюць сумесна навукоўцы Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» і Франкфурцкага заалагічнага таварыства.

Для назірання беларускія і нямецкія вучоныя задзейнічалі цэлы комплекс сучасных метадаў даследавання. Некаторым ваўкам будуць надзеты спецыяльныя аброжкі з датчыкамі, каб счытваць інфармацыю. Мяркуецца, што будзе адлоўлена не менш за тры драпежнікі, якія і стануць насіць аброжкі. На закупку такога абсталявання сёлета выдаткавана каля 15 тысяч еўра.

У лесе таксама расстаўлена паўтара дзясятка фотапастак. Відэакамеры размясцілі ў месцах магчымага знаходжання звера, на асноўных яго сцяжынах. Фіксацыя будзе праводзіцца ў любы час сутак. Немалыя сродкі трацяцца на тое, каб вывучыць стан здароўя звера, яго генетычныя асаблівасці, вызначыць перспектывы папуляцыі.

Яна СВЕТАВА.

ЯПОНСКІЯ ЧЫГУНАЧНІКІ МОГУЦЬ АПРАНУЦЦА Ў ФОРМУ АД «МАГАТЭКС»

Вырабы магілёўскіх тэкстыльшчыкаў прыцягнулі ўвагу японскіх спажыўцоў падчас выстаўкі Private Label Trade Shop Japan 2014, якая праходзіла ў Токіа з 18 па 21 лютага. Як адзначылі на ААТ «Магатэкс», такія буйныя японскія трэйдары, як Atmosphere Japon.Co., LTD, Belnatio, DA&G (Defense Apparel and Goods) праявілі зацікаўленасць у пастаўках тканін для сталовай бялізны, уніформы для работнікаў чыгункі, пажарных службаў.

Прадпрыемства рыхтуе 12 камерцыйных прапаноў, якія будуць прадстаўлены японскім кампаніям у самыя кароткія тэрміны. А гандлёвая кампанія DA&G нават плануе наведаць ААТ «Магатэкс» гэтай вясной. Падчас выстаўкі кіраўніцтва «Магатэкса» правяло 20 бізнес-сустрэч, стэнды таварыства наведалі 50 японскіх бізнесменаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МАНЕТА-ФІКЦЫЯ З КРЫМІНАЛЬНЫМ ПАДТЭКСТАМ

У інтэрнэце з'явіліся паведамленні аб продажы на замежным рынку падробленых манет з выявай, аналагічнай малюнку на памятнай беларускай манеце з медна-нікелевага сплаву «Чэмпіянат свету па футболе 2014 года. Бразілія». Нагадаю, што сапраўды наша манета гэтай серыі і наміналам 1 беларускі рубель была ўведзена ў абарачэнне Нацбанкам краіны яшчэ летась 14 мая.

Манета-фікцыя распазнаецца даволі проста, бо асноўнае адрозненне ад арыгінала можна ўбачыць пры разглядзе яе выяў, дзе на аверсе ўказваецца год выпуску (2014), а трэба — 2013. Акрамя таго, падробленыя манеты могуць мець адрозныя ад сапраўднай манеты тэхнічныя характарыстыкі (сплаў, маса, дыяметр).

У сувязі з гэтым Нацыянальны банк Беларусі нагадвае, што за выраб або збыт падробленых грошай і плацежных сродкаў прадугледжана крымінальная адказнасць. Менавіта толькі Нацбанк валодае выключным правам эмісіі грошай і на падставе часткі 12 артыкула 29 і часткі першай артыкула 39 Банкаўскага кодэкса Беларусі выпускае ў абарачэнне памятныя манеты, удакладнілі рэдакцыі ў прэс-службе гэтага ведамства.

Сяргей КУРКАЧ.

СЕМ ЧАЛАВЕК ВЫРАТАВАЎ... АПАВЯШЧАЛЬНІК

Маленькі прыбор сігналам папярэдзіў аб пажары і выратаваў жыццё адразу сямі чалавек, у тым ліку маленькага дзіцяці.

— Увечары гарэў дах у аднапавярховым цагляным жылым доме на вуліцы Азёрнай у вёсцы Уна Лёзненскага раёна. Там пражываюць гаспадыня, 1958 года нараджэння, яе муж, два сыны, дачка, зяць і 2-гадовы ўнук. На момант узнікнення пажару сям'я знаходзілася ў доме. Пачуўшы сігнал апавяшчальніка, людзі выйшлі на вуліцу і не пацярпелі. Апавяшчальнік усталявалі летась за кошт сродкаў Лёзненскага сельскага Савета, — паведаміла «Звяздзе» Марына ФАНДО, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

У выніку пажару была знішчана частка даху, пашкоджаны столь, сцены, маёмасць. Але жыллё прыдатнае для далейшага пражывання.

Мяркуецца, што прычына пажару — трэшчына ў коміне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАНТРАБАНДА НА BR1,5 МЛРД

У пункце пропуску Славечна памежнікі сумесна з супрацоўнікамі Гомельскай мытні знайшлі паўтысячы схаваных планшэтаў і тэлефонаў.

Гаджэты былі размешчаны ў міжстолевай прасторы вентыляцыйных шахт лакаматыва цягніка «Жытомір — Баранавічы». Незаконны тавар быў расфасаваны ў 12 поліпрапіленавых пакетаў. Машыністы цягніка факт знаходжання дарагога грузу растлумачыць не змаглі. Уся тэхніка канфіскавана мытнікамі. Яе прыблізны кошт — 1 534 800 000 руб.

СУМНАЯ РЫБАЛКА

74-гадовага рыбака ў Петрыкаве выратавальнікі эвакуіравалі з ільду на Прыпяці пасля таго, як пенсіянер зламаў нагу.

На старым рэчышчы ракі мужчына лавіў рыбу, але выпадкова паслізнуўся, упаў і адчуў востры боль. Яго таварышам прыйшлося выклікаць супрацоўнікаў МНС, паколькі пацярпелы не мог самастойна перасоўвацца. Выратавальнікі цягнулі рыбака па лёдзе каля кіламетра на спецыяльнай дошцы, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. На беразе яго перадалі медыкам. З дыягназам «пералом шыйкі правай сцегнавой косці» мужчына шпіталізаваны ў раённую бальніцу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Дзяржаўны клопат

ЭНЕРГІЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ

Побач з гідраэлектрастанцыяй на Нёмане з'явіцца сонечная электрастанцыя

У краіне, дзе амаль няма ўласнай нафты і газу, неабходна больш актыўна і эфектыўна выкарыстоўваць аднаўляльныя крыніцы энергіі. Такой аксіёмай сустрэў журналістаў — удзельнікаў прэс-тура ў Гродзенскую вобласць генеральны дырэктар прадпрыемства «Гроднаэнерга» Уладзімір ШАТЭРНІК. Потым ён з задавальненнем пазнаёміў нас з работай Гродзенскай гідраэлектрастанцыі, у стварэнні і запуску якой прымаў самы непасрэдны ўдзел.

СІЛА ВАДЫ, ВЕТРУ І СОНЦА

Менавіта тут, на рацэ Нёман, у нашай краіне была ўпершыню пабудавана гідраэлектрастанцыя сярэдняй магутнасці. Увогуле аб'ект будаваўся на працягу 52 месяцаў, пасля чаго ў жніўні 2012 года ён пачаў выдаваць рэгіёну электрычнасць.

Сёння спецыялісты адзначаюць, што Гродзенская ГЭС працуе яшчэ больш эфектыўна, чым меркавалася. Гідраэлектрастанцыя ўяўляе сабой складаны механізм: калі ад створанага вадасховішча агульным аб'ёмам у 2 млн «кубоў» вады, раку адгароджвае жалезабетонная плаціна з электратэхнічным абсталяваннем. Вада імкнецца на ніжэйшы ўзровень, што і прымушае круціцца турбіны, якія выпрацоўваюць электрычную энергію. Потым пяць генератараў магутнасцю 3,4 МВт кожны выдаюць ад станцыі агульную магутнасць у 17 МВт.

Праектная гадавая выпрацоўка электрычнай энергіі прадугледжвала атрымліваць ад станцыі 84,4 млн кВт·г, а на практыцы летась наша ГЭС «намалаціла» ажно 91,7 млн кВт·г. Эксперты падлічылі, што такое выкарыстанне сілы вады дазволіла энергасістэме вобласці сэканоміць 25,3 тысячы тон умоўнага арганічнага паліва.

«Мы фактычна пацвердзілі правільнасць прынятых пры праектаванні будаўнічых і інжынерных рашэнняў, а таксама эфектыўнасць чэшскага абсталявання (кампаніі Mavel). Атрыманне за год такой колькасці «чыстай» электраэнергіі дазволіла краіне не спальваць за сезон 22,3 млн кубічных метраў газу і скараціць выкід шкодных рэчываў у атмасферу на 28 тон. Атрыманая эканомія па паліве дасягае 15 млн долараў, бо сабекошт вытворчасці энергіі склаў па выніках года 2,6 цэнта ЗША за кВт.г,» — паведаміў гендырэктар.



Адна з пяці турбін Гродзенскай гідраэлектрастанцыі.

ДАВЕДКА:

установленая электрычная магутнасць усіх крыніц комплексу «Гроднаэнерга» складае 376,1 МВт, у тым ліку ЦЭЦ — 355,5 МВт, ГЭС — 19 МВт, ВЭУ — 1,5 МВт. Энергію вады пераўтвараюць у электрычнасць 8 аб'ектаў вобласці — Гродзенская ГЭС (17 МВт) і 7 міні-гідраэлектрастанцый магутнасцю ад 100 да 720 кВт кожная. Ветраэнергетычная ўстаноўка мае «прапіску» побач з населеным пунктам Грабнікі Навагрудскага раёна.

Усяго з пачатку эксплуатацыі ГЭС выпрацоўка электраэнергіі склала 128,9 млн кВт·г. Ці насамрэч гэта шмат, калі за год атрымліваецца каля 92 млн кВт·г? Калі узяць спажыванне электрычнасці па ўсёй краіне разам з прамысловымі гігантамі, то гэта не так шмат, аднак... Гродзенская станцыя дае столькі электраэнергіі, якой хопіць усім спажыўцам Шчучынскага раёна, або задаволіць патрэбу насельніцтва ў электрычнасці адразу трох раёнаў: Шчучынскага, Гродзенскага і Бераставіцкага.

Актыўна плануюць у вобласці выкарыстоўваць і іншыя аднаўляльныя крыніцы энергіі. Уладзімір Шатэрнік нагадаў аб тым, што ў Навагрудскім раёне быў зроблены пілотны праект першай у краіне ветраўстаноўкі. Сёння такая эксперыментальная электрастанцыя паспяхова дзейнічае і паказвае разліковую магутнасць. Усё гэта добра, але ў нашых энергетыкаў цяпер існуюць і больш амбіцыйныя планы. Маецца на ўвазе стварэнне сонечнай электрастанцыі магутнасцю каля 200 кВт. Гэты новы для вобласці праект запланавана ажыццявіць на пляцоўцы плошчай 0,8 га непасрэдна побач з Гродзенскай гідраэлектрастанцыяй. Нагадаю, што ў Шчучынскім раёне прыватным інвестарам ужо пабудавана сонечная электрастанцыя, якая паспяхова адпрацавала больш як 4 месяцы. Зацікаўленасць інвестара тут зразумелая: энергасістэма набывае такую «сонечную» электрычнасць у вытворцаў па тарыфах з павышальным каэфіцыентам 3. Кошт электрычнасці ад сілы ветру ці вады мае павышальны каэфіцыент усяго 1,3.

Кошт будаўніцтва гэтай гідрастанцыі на Нёмане склаў 118,4 млн долараў. Будаўніцтва яе было прадугледжана Дзяржаўнай праграмай інавацыйнага развіцця Беларусі на 2011-2015 гады. Поўны цыкл акупнасці праекта, з улікам абслугоўвання крэдытных рэсурсаў, складае каля 20 гадоў. Разам з тым, гэты тэрмін магчыма значна скараціць, калі ўлічваць плюсы энергіі вады ў комплексе.

ЭКАЛОГІЯ, ПРЫРОДА І НОВАЕ ЖЫЦЦЁ РЭГІЁНА

Пры ўзвядзенні гідраэлектрастанцыі было створана вадасховішча агульнай плошчай да 2 тысяч гектараў, даўжынёй каля 44 кіламетраў і шырынёй да 1,5 кіламетраў. Пры арганізацыі штучнага вадаёма не ажыццяўлялася адсяленне жыхароў, зносу гаспабудоў і затаплення сельскагаспадарчых земляў, як гэта звычайна бывае пры з'яўленні падобных аб'ектаў. Увогуле створанае вадасховішча не выходзіць за памеры былой поймы ракі падчас веснавой паводкі, што сведчыць аб сучаснай экалагічнасці праекта. Больш за тое, праект прадугледжваў добраўпарадкаванне 300 гектараў земляў, тэрыторыя якіх раней увогуле не выкарыстоўвалася. Узніклі новыя дарогі, пабудаваны мост і створана зона перспектыўнай гадоўлі рыбы плошчай 105 га. Сабекошт гэтага вадаёма дасягнуў 30 млн долараў. Падобныя інвестыцыі заўсёды даюць прыбытак дзяржаве. Вакол самаробнага возера з'явілася шмат унікальных месцаў для адпачынку і нават развіцця бізнесу.

Цяпер вакол вадасховішча ў некалькі разоў павялічыўся кошт зямельных участкаў. На занятых участках актыўна будуюцца сучасныя жылыя дамы і катэджы. Узнікненне новай экасістэмы павінна даць пэўны штуршок для далейшага развіцця ў рэгіёне аграэкатурызму.

Спецыялісты адзначаюць, што ўжо цяпер вакол вадасховішча ў некалькі разоў павялічыўся кошт зямельных участкаў. На занятых участках актыўна будуюцца сучасныя жылыя дамы і катэджы. Узнікненне новай экасістэмы павінна даць пэўны штуршок для далейшага развіцця ў рэгіёне аграэкатурызму. Аднак пакуль сур'ёзных рашэнняў па выдзяленні зямельных участкаў для ажыццяўлення буйных бізнес-праектаў яшчэ не прымалася. Цяпер тут эксперты вядуць распрацоўку генплана па развіцці і асваенні земляў вакол Гродзенскага вадасховішча. А пакуль што ў гэтых мясціна самая лепшая рыбалка.

Гаворачы ў цэлым аб развіцці беларускай гідраэнергетыкі, Уладзімір Шатэрнік адзначыў, што ў ходзе праектавання і будаўніцтва Гродзенскай ГЭС, у якім бралі ўдзел пераважна беларускія прадпрыемствы і арганізацыі, атрыманы ўнікальны і вельмі каштоўны вопыт у гэтай сферы. Цяпер пры праектаванні і будаўніцтве Полацкай, Віцебскай і Бешанковіцкай ГЭС можна смела яго выкарыстоўваць. У гэтым выпадку не трэба прыцягваць замежныя рэсурсы і траціць валюту, больш за тое — можна аптымізаваць выдаткі, абапіраючыся на гродзенскі вопыт.

Уладзімір Шатэрнік паведаміў, што ў апошні час працягваюцца актыўныя пошукі інвестара для рэалізацыі праекта па будаўніцтве другой гідраэлектрастанцыі — Нямноўскай ГЭС магутнасцю да 20 МВт. Яе меркавалася размясціць у 20 км ад Гродна ніжэй па цячэнні ракі, у раёне населенага пункта Плябанскае, недалёка ад Аўгустоўскага канала і адлегласцю ў 5-6 км ад Літвы. «Мы звярнуліся ў кампаніі розных краін, але пакуль яны не выказалі жадання ўкладваць сур'ёзныя грошы ў будаўніцтва. Беларускі бок гатовы ажыццявіць гэты праект нават на ўмовах прамых інвестыцый», — удакладніў нашу пазіцыю гендырэктар.

Уладзімір ШАТЭРНІК.

ГАЗАТУРБІННАЯ ЎСТАНОЎКА НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Яшчэ адзін праект гродзенскіх энергетыкаў — маштабная рэканструкцыя Гродзенскай ЦЭЦ-2 з устаноўкай газатурбіннай устаноўкі ажыццяўляўся на працягу трох гадоў. Планавая магутнасць гэтай газатурбіннай устаноўкі складае амаль 122 МВт. Кошт яе будаўніцтва — 99,27 млн долараў.

Асаблівасцю такога ўнікальнага праекта з'яўляецца «ўвязванне» сучаснай устаноўкі ў цеплавую схему ЦЭЦ высокага ціску. Высокатэхналагічная аперацыя па гэтым праекце была праведзена з улікам ужо існуючага беларускага абсталявання, калі кацёл-утылізатар уключылі ў паравыя магістралі электрастанцыі без будаўніцтва і ўстаноўкі дадатковага паратурбагенератара. Падобная схема мадэрнізацыі ЦЭЦ зрабіла праект значна таннейшым. Упершыню ў айчынную энергасістэму было пастаўлена абсталяванне індыйскай кампаніі BHEL.

Сёння ўдзельны расход паліва пры вытворчасці энергіі складае, напрыклад, на Бярозаўскай ГРЭС 360 грам умоўнага паліва на кВт·г, на Лукомльскай — 310 г, на Гродзенскай ЦЭЦ-2 пасля яе мадэрнізацыі гэты паказчык дасягнуў 173 г. Новая ўстаноўка дазваляе знізіць узровень спальвання газу ў аб'ёме каля 90 тысяч тон умоўнага паліва, што дазволіць сэканоміць не менш як 20 млн долараў за год. Пры гэтым тэрмін акупнасці праекта складае максімум 7 гадоў.

Беларуская энергасістэма актыўна мадэрнізуе асноўныя фонды, развівае генерыравальныя крыніцы. Гэта звязана з тым, што пакуль мы маем досыць вялікі знос асноўных фондаў. З другога боку, краіна імкнецца выкарыстоўваць высокія тэхналогіі ў сферы энергетыкі. «На бліжэйшыя гады запланаваны да ўводу вялікія аб'ёмы газапаравых цыклаў у Віцебскай і Мінскай абласцях. З улікам запланаваных мерапрыемстваў можна ўпэўнена сказаць, што знос асноўных фондаў ужо праз год паменшыцца да 40% у цэлым па краіне. У такім выпадку мы атрымаем больш надзейную энергасістэму, якая будзе адпавядаць патрабаванням часу па эфектыўнасці», — сказаў Уладзімір Шатэрнік.

Сяргей КУРКАЧ.

Мінск — Гродна — Мінск

■

■ Кулуары

«МЫ ВЕДАЕМ , ЯКІ САЮЗ ХОЧАМ...»

Ці ўзнікнуць праблемы з прызнаннем ЕЭС?

Да выхаду на сусветны рынак новага гульца — Еўразійскага эканамічнага саюза — застаецца менш за год. Але пакуль што з дня ў дзень ідзе абмеркаванне праекта дагавора аб ЕЭС, які павінен быць падрыхтаваны да мая гэтага года. Ці паспеюць пра ўсё дамовіцца прадстаўнікі трох краін (Беларусі, Расіі і Казахстана)? Чым будзе будучы саюз — міжнароднай арганізацыяй ці проста аб'яднаннем дзяржаў? Пра гэта расказаў старшыня праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь, член Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргей Румас напярэдадні пасяджэння Савета ЕЭК, які прайшоў у Мінску 18-19 лютага.

Кіраўнік Банка развіцця сцвярджае, што цяпер ідзе напружаная праца над дакументамі. «Зразумела, што засталося мала часу. Да 1 мая мы павінны гэтую працу скончыць. Два дні работы Савета будуць прысвечаны абмеркаванню дагавора». Як аказалася пасля, менавіта гэтае пытанне і абмяркоўвалася найбольш бурна. Бо Дагавор аб стварэнні саюза — гэта базавы дакумент, які вызначыць асаблівасці фарміравання ЕЭС. «Па-першае, мы ў ім фактычна рэалізуем усю базу, якая ў нас была ў Мытным саюзе і ЕўрАзЭС. Іншымі словамі, мы яе проста кадыфікуем, і яна трапляе туды аўтаматычна», — растлумачыў Сяргей Румас. Бакі вызначылі, што не дапускаецца адыход ад раней дасягнутых дамоўленасцяў. У дадатак да іх з'явяцца новыя напрамкі, якія будзе весці Еўразійскі эканамічны саюз. «Таму казаць, што мы нешта новае распрацоўваем, тое, пра што ніхто не ведае, не зусім правільна. Мы ведаем, які саюз мы хочам зрабіць — задачу нам сфармулявалі прэзідэнты. Проста ёсць юрыдычныя моманты. Напрыклад, ЕЭС будзе міжнароднай арганізацыяй, якой нададзена правасуб'ектнасць ці гэта проста саюз дзяржаў?» Некаторыя юрысты лічаць, што калі саюз не будзе зафіксаваны ў дагаворы як міжнародная арганізацыя, то ўзнікнуць пытанні з яго прызнаннем на міжнароднай арэне. Аднак Еўрапейскі саюз — гэта не міжнародная арганізацыя. «Хіба з ЕС (звычайным саюзам дзяржаў) не лічацца?» Але пакуль спрэчкі ідуць. Пры гэтым Сяргей Румас ацэньвае ступень гатоўнасці дакументаў як высокую.

Дарэчы, цікава, ці выйдзе наш Банк развіцця на фінансаванне якіх-небудзь еўразійскіх праектаў? «Мне цяжка сказаць, — заявіў Сяргей Румас. — У нас пакуль што і ў Беларусі ёсць куды рухацца. Таму, хутчэй, мы засяродзімся на сумесным фінансаванні праектаў з Еўразійскім банкам развіцця. Калі ўсё складзецца, мы разам будзем фінансаваць адзін буйны праект, але на тэрыторыі Казахстана і Расіі мы нічога не збіраемся фінансаваць». Аднак гэта дзіўна. Бо летась банк супрацоўнічаў нават з Манголіяй, калі прафінансаваў пастаўкі «БелАЗаў». А як жа нашы асноўныя партнёры? «Падтрымка экспарту застаецца асноўнай задачай нашага банка. Але сёння, на жаль, сітуацыя такая, што рынак «прасеў» і патрэба ў новай тэхніцы знізілася. Пытанне не стаіць у тым, аказаць фінансавую падтрымку або не аказаць — пакупнікі прыпынілі закупкі. Усе чакаюць аднаўлення рынкаў. Тады і мы будзем гатовыя падставіць фінансавае плячо. Сёлета ў нашых планах і 80 млн долараў праз Банк развіцця, і 100 млн праз «Прамагралізінг» накіраваць на падтрымку беларускага экспарту. Цяпер шмат здзелак у рабоце, пра якія не хочацца пакуль гаварыць».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Рынак паслуг

У SPA-САЛОНАХ НАВЯДУЦЬ ПАРАДАК

А для адкрыцця СТА ў гаражы распрацуюць асобную інструкцыю

Словазлучэнне SPA-салон вядома, думаю, многім беларускам. Яшчэ некалькі гадоў таму яно гучала як нешта экзатычнае, моднае, «крутое», нават элітнае. Але сёння падобныя салоны з адпаведнымі паслугамі трапляюцца ледзь не на кожным кроку. Што ж хаваецца за шматлікімі рэкламнымі шыльдамі з надпісам «SPA-комплекс»? Якія паслугі мы можам атрымаць у такім месцы? Як ацаніць якасць гэтых паслуг? Адказаў на гэтыя пытанні дагэтуль няма. А гэта такія ж самыя бытавыя паслугі, як, скажам, паслугі цырульняў. Таму Міністэрства гандлю збіраецца распрацаваць да канца года дакумент для рэгламентацыі дзейнасці SPA-комплексаў. Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінгандлю Беларусі Валянціна ЛЯЎКОЎСКАЯ.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАЗВАЎСЯ КОМПЛЕКСАМ...

«У прыватнасці, не зразумела, якія паслугі і ў якім аб'ёме павінны аказваць SPA-комплексы, — тлумачыць пазіцыю міністэрства прадстаўніца ведамства. — Нарматыўна-тэхнічны акт, над якім мы зараз працуем, будзе накіраваны на павышэнне якасці SPA-паслуг». Напрыклад, з'явіцца стандарт для такіх паслуг, пералік патрабаванняў да персаналу аб'ектаў. Каб называцца SPA-цэнтрам, установа будзе абавязана аказваць за пэўную колькасць гадзін пэўны спектр паслуг. «Установа, якая будзе прапаноўваць, да прыкладу, толькі адну паслугу, SPA-комплексам называцца не зможа», — падкрэсліла начальнік упраўлення. Будуць распрацаваны асаблівыя падыходы да захавання ў SPA-комплексах патрабаванняў гігіены, выкарыстання розных відаў матэрыялаў.

СТА АКТЫЎНА ЛЕГАЛІЗУЮЦЦА

Валянціна Ляўкоўская таксама паведаміла, што ў краіне плануецца распрацаваць пакрокавую інструкцыю па адкрыцці станцыі тэхнічнага абслугоўвання ў гаражы. Над дакументам будзе працаваць Міністэрства гандлю сумесна з Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. У інструкцыі будзе нават паказана, як правільна скласці заяву і ў які орган яе накіраваць. Будуць падрабязна распісаны асаблівасці працы з рэгістрацыйнымі дакументамі, указаны патрабаванні да ўстанаўлення рэжыму працы гаража, патрабаванні пажарнай бяспекі і іншае.

Нагадаем, што выкарыстоўваць у якасці аўтамабільных майстэрняў гаражы, размешчаныя на тэрыторыі гаражных кааператываў, дазволіў Указ Прэзідэнта № 432 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. № 43», які ўступіў у сілу 1 лістапада мінулага года. Раней гаражны кааператыў (месца ў гаражным кааператыве, гараж) мог служыць толькі для захоўвання аўтамабіля.

Намеснік начальніка ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінгандлю Аксана ПАДАРОЖНАЯ дадала, што цяпер у Беларусі зарэгістраваны і ажыццяўляюць дзейнасць па аказанні паслуг аўтасэрвісу ў гаражах 150 індывідуальных прадпрымальнікаў. А гэта значыць, што за тры апошнія месяцы колькасць гаражных СТА павялічылася больш чым у 9 разоў (на пачатку снежня 2013 года было зарэгістравана 16 такіх аб'ектаў). «Мы прагназавалі, што новая паслуга будзе карыстацца папулярнасцю», — адзначыла спецыяліст і патлумачыла, што ў апошнія гады свядомасць прадпрымальнікаў імкліва змяняецца: усё больш людзей хоча аказваць менавіта легальныя паслугі, працаваць спакойна, не баяцца праверак падатковых і іншых органаў, а таксама міжведамасных груп. «Мы спадзяёмся , што магчымасць рэгістраваць СТА ў гаражах, якая ўсё яшчэ з'яўляецца новай для Беларусі, выведзе з ценю многіх прадпрымальнікаў-нелегалаў».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Ёсць ідэя!

АД СТАРТАПА ДА БІЗНЕСУ

Лепшыя праекты ў сферы IT будуць узнагароджаныя на конкурсе Belarus Startup 2014, фінал якога пройдзе 25 красавіка падчас форуму TIBO. Пераможцы атрымаюць аплочаныя праграмы акселерацыі і стажыроўкі для развіцця ўласнага бізнесу на базе сваіх праектаў. Па словах арганізатараў, галоўная мэта конкурсу — выявіць лепшыя айчынныя стартапы (бізнес-ідэі) і дапамагчы ім выйсці на глабальныя рынкі. На прэс-канферэнцыі журналістам распавялі аб асаблівасцях сёлетняга конкурсу.

— Вельмі важная для нас задача — выхаваць у моладзі дух прадпрымальніцтва, — лічыць **выканаўчы дырэктар ГА «Інфармацыйнае грамадства» Сяргей ЕНІН.** — Хацелася б, каб творчы характар многіх маладых людзей дапамагаў ім весці сваю справу. Тым больш што існуюць перспектывы «вырошчвання» буйных кампаній са звычайных студэнцкіх праектаў.

— Апошнім часам Беларусь паказвае ўражальныя вынікі ў сферы IT, — паведаміў **дырэктар бізнес-інкубатара IT-House Аляксандр МЯЛЕШЧАНКА.** — За мінулы год кампанія Wargaming, заснаваная беларусам, атрымала паўмільярда долараў прыбытку. Зусім нядаўна беларуска-ізраільскі месенджар (сэрвіс для абмену паведамленнямі праз інтэрнэт. — **Аўт.**) Viber быў набыты адным з японскіх канцэрнаў за 900 мільёнаў долараў. Мы б хацелі, каб такіх праектаў у Беларусі станавілася больш.

Па словах арганізатараў Belarus Startup 2014, грашовыя прызы на падобных конкурсах удзельнікам звычайна не выплочваюцца. Значна больш плёну даюць сертыфікаты на праходжанне навуковых праграм у сферы IT. Такія прызы гарантуюць, што праекты-пераможцы не заглохнуць адразу ж пасля заканчэння конкурсу. На фінале мерапрыемства будуць прысутнічаць інвестары з розных краін, якія фінансава дапамогуць новым праектам развівацца. Удзельнікі леташняга конкурсу стартапаў, праект Recommerce, прайшлі стажыроўкі ў Кіеве, Маскве і Сан-Францыска, пасля чаго адкрылі офісы ў некалькіх краінах свету.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

ДАРЭЧЫ

35 тысяч суб'ектаў гаспадарання (20 тысяч юрыдычных асоб і 15 тысяч «іпэшнікаў») прадастаўляюць каля тысячы бытавых паслуг. Прычым больш за 80% з іх аказваюць недзяржаўныя арганізацыі. У краіне дзейнічаюць больш за 21 тысячу аб'ектаў бытавога абслугоўвання, каля 4 тысяч аўтасэрвісаў, прыкладна 200 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, 106 раённых камбінатаў бытавога абслугоўвання, 1490 комплексных прыёмных пунктаў. За мінулы год было адкрыта 1140 новых аб'ектаў бытавога абслугоўвання.